## «Згадаць вайну...»

Згадаць вайну, як цяжкі груз пранесці!..
А як было ўсім жах той перажыць,
Як самалёты вылі ў паднябессі,
На новыя зайшоўшы віражы?!

Як цяжар сталі і агню смяротны
На крылах неслі, свастыку-крыжы
Краіне мірнай, у вайну – гаротнай…
А дух народа ім не задушыць!

Згадаць вайну – ні піць табе, ні есці:
Свядомасць – боллю, і душа дрыжыць,
Пачуўшы зноў, як дзеткі плачуць дзесьці –
З апаленымі крыламі стрыжы.

А іншыя – на небе ўжо анёлкі!..
А ім ствараць бы шчасця вітражы
Тут, на зямлі. Навошта гора столькі
Праз лёс людзей ракою слёз бяжыць?!

Нялёгка войн загойваюцца раны,
Боль-памяць – на пярэднім рубяжы.
Аб гэтым скажа кожны ветэран вам,
Як трэба мірам сёння даражыць!

Згадаць вайну, як цяжкі крыж пранесці...